The Byelorussian Times

ЧАС
Двумоўны беларускі часапіс у З.Ш.А.

No.57, Vol.11, USPS 345—170 | November 1986 | 9—06 Parsons Blvd., Flushing, N.Y. 11357 | Price $1.35

In the BSSR some of the Byelorussian intelligentsia are raising alarm over the plight of the Byelorussian language in the Republic.
Some are uging that legislation be adopted to raise the status of Byelorussian in the BSSR, others want Byelorussian to be declared the state language of the Republic.

BYELORUSSIAN LANGUAGE IS IN TROUBLE

•From *The Ukrainian Weekly,* October 19, 1986• "What is there that is Byelorussian about our urban general education shools?" asks Kastus Tarasau in the recent issue of the Byelorussian literary weekly *Litaratura i Mastatstva.* Virtually nothing is the answer. In fact, in the entire Byelorussian SSR there is, according to the republic's Ministry of Education, only one urban school where Byelorussian is the language of instruction. This is secondary school No. 108 in Minsk. Yet, when Mr. Tarasau visited this unique institution he found that the situation there was rather different from what he had expected.

"I visited this shool, imagining naively that with my own eyes I would see, for example, signs over the classrooms, school newspapers and stands in Byelorussian. No, in this regard everything in school No. 108 is like everywhere else. And, of course, it cannot be otherwise because of the 800 pupils in this school only about 90 receive their instruction in Byelorussian (the beginning classes and the 6-year-olds)", he wrote.

In fact, therefore, the late academician Fedot P. Filin was quite correct when, some years ago, he declared with a degree of undisguised satisfaction that all schools in the Byelorussian capital were Russian-language schools.

A related and an important problem is the right of parents to petition school authorities that their children be exempted from studying Byelorussian as a subject. This, in fact, is the main theme of Mr. Tarasau's article which was commissioned by *Litaratura i Mastatstva* in response to a reader's letter to the editor arguing that legislation be adopted to safeguard the native language. The letter, from a teacher in Vitebsk, was published by the newspaper along with Mr. Tarasau's article.

The teacher, F. Siuko, writes that according to unofficial regulations, exemptions from studying Byelorussian are granted to children of military personnel, children with health problems, and to non-Byelorussian pupils. In practice, however, school authorities routinely grant exemptions to anyone who wants them. Thus, in the fourth grade of one school that has 30 Byelorussian and 12 Russian pupils, all of them in good health, the Byelorussian language is studied by eight Russian and three Byelorussian pupils.

Moreover, it turns out that it is none other than the Byelorussian intelligentsia and professionals that most frequently request such exemptions. The overwhelming majority of those who do study Byelorussian, notes Mr. Siuko, are the children of workers. The situation is "horrifying", he says, "and even the children themselves are aware of this." According to Mr. Siuko, "there is one solution: halt the flood of frivolous attitudes toward that which is most fundamental to national culture — the native word — by force of law."

Mr. Tarasau provides more details based on official statistics. In Minsk, where there are more than 100,000 pupils, over 11,000 have been exempted from studying Byelorussian. These are mostly the children of physicians, engineers, military officers and other professionals. What is most disconcerting is that among those who have successfully requested exemptions are teachers, university lecturers and employees of the republic's Ministry of Education, including Byelorussian-language specialists. The fact that a teacher demands that his child be exempted from learning his native language, writes Mr. Tarasau, "is an open challenge to education, a manifest display of arrogance towards one's language and culture."

The problem, of course, is that well-educated parents, wishing the best for their children, including a good education, see nothing to be gained from their children studying the Byelorussian language. Imagine, writes Mr. Tarasau, 11,000 parents coming to the school authorities and demanding that their children be freed of the burden of studying physics or the English language.

"To the pristine mind, everything can be useful in life — gymnastics, figure skating, knowing how to play the mandolin, the Chinese language — in short, everything except the Byelorussian language. As the parents see it, what is to be gained from it? Where is it needed?"

"Perhaps," suggests Mr. Tarasau, "if our language figured in the entrance examinations of all institutions of higher education in the republic, then the problem of *exemptions* would be solved in one day." Like the teacher from Vitebsk, Mr. Tarasau is suggesting that legislation be adopted that would raise the status of Byelorussian in the republic. "Why is it that only the Byelorussian language is deprived of the right of equality and obligatory study?" he asks rhetorically.

This is obviously not the first time that representatives of the Byelorussian intelligentsia have raised the problem of the role and status of the Byelorussian and, more generally, the plight of Byelorussian national culture in the Soviet Union. These issues have been discussed in the press as well as in samizdat publications over the years.

More recently, at the writers' congress in Moscow, Nil Hilevich (a Byelorussian writer) put his finger on "the strong contraction in the sphere of utilization of the native language in the republic, in the masses and especially in the schools — and now not only in the urban, but also in the rural

(continued on page 3)

An Exhibition of Byelorussian Books in Australia

БЕЛАРУСЬ І ЯЕ КНІГІ
ВЫСТАЎКА



BELORUSSIA AND ITS BOOKS
DEPARTMENT OF SLAVIC LANGUAGES
MONASH UNIVERSITY



THE GENIUS OF THE BYELORUSSIAN GOLDEN AGE FRANCISAK SKARYNA (1486?-1551?), PRINTER AND TRANSLATOR OF THE BIBLE INTO BYELORUSSIAN. ON THE LEFT, SKARYNA'S SELF-PORTRAIT AND ON THE RIGHT ONE OF THE TITLE PAGES FROM HIS BIBLE. BOTH ILLUSTRATIONS APPEAR ON THE COVERS OF THE COMMEMORATIVE PAMPHLET PRINTED FOR THE EXHIBITION OF BYELORUSSIAN BOOKS AT MONASH UNIVERSITY.

On Monday, November 17, 1986, an exhibition of Byelorussian books was opened at Monash University in Clayton, Australia. The exhibition is organized by the Department of Slavic Languages and the Monash University Library in recognition of the contributions to the Slavic collection of the library made by the local Byelorussian community, At the opening ceremony in the Main Library's conference room special samples of Byelorussian cuisine were served.

Professor Jiri (George) Marvan, Chairman of the Department of Slavic Languages, who is primarily responsible for the exhibition, also compiled an impressive 60-page pamphlet entitled "Belorussia and its Books" to accompany the exhibition. The pamphlet contains 31 illustrations and maps from the early period of Byelorussian history to the present day and briefly, but generally favorably describes the main trends of Byelorussian history, religion, culture, literature and language, although in some instances Soviet sources were used with which free Byelorussians do not fully agree.

Prof. Marvan acknowledges in his pamphlet the help of four persons from the Monash University and from the Byelorussian community: Rev. A. Kulakouski, Mr. N. Nikon and Mr. M. Skabiej.

The exhibition contains nearly 200 samples of Byelorussian books and publications printed both in the West and in Soviet-occupied Byelorussia. There is also an exhibition of Byelorussian folklore, no doubt organized by the Byelorussian community.

This is the first exhibition of this type in Australia and in many ways it is similar to the exhibition of Byelorussian books held by the New York Public Library a number of times in the past. The exhibition at Monash University will close in March 1987. More details about the exhibition will be printed later as they become available.

JEWS SEEK ALLIES AMONG UKRAINIANS

The *Jeresalem Post's* report of November 10, 1986, on the Demjanjuk case stressed the need for Ukrainian-Jewish reconciliation and expressed its concern that the case might affect such efforts.

Demjanjuk is currently in an Israeli prison accused of collaborating with the Nazis during World War II. The evidence against Denjanjuk, who denies that he is the man sought be Israel, is unconvincing. Apparently, the only way that the charge can be even remorely substantiated is with the help of the Soviet Prosecutor's office. But, as everyone knows, the Soviets are notorious for falsifing evidence and the Soviet Prosecutor can not be relied upon as a source of reliable evidence. Furtheremore, Moscow has an interest in making all emigres who escaped to the West look like traitors or Nazis.

The *Jerusalem Post* goes on to say:

"The fate of Ukrainian nationalists and Soviet Jews are linked in a common fight for freedom.... the Ukrainian need for Jewish allies and the Jewish need for allies among Ukrainians should temper suspicions (among them). The Jews and Ukrainians must find ways of opening a new dialogue, one which frankly confronts the tragedies and crimes of the past, but which also aspires to a better future.

"As for the Demjanjuk case, it is vital that Israel not undermine efforts in the direc-

(continued on page 4)

На Сьвяце Беларускіх Гэрояў у Нью-Ёрку



ПРАМАЎЛЯЕ СП. Я. ЯСЬВІЛОВІЧ

За свабоду сваю
Ўсёй душой пастаю;
У вагонь, у ваду
Я за ёю пайду.

Беларускае Нацыянальнае Сьвята Гэрояў, якое традыцыйна прыпадае ў канцы лістапада, на гадавіну Слуцкага паўстаньня, у гэтым годзе ў Нью-Ёрку абыходзілася ў нядзелю 7-га сьнежаня.

Сьвяткаваньне пачалося Малебнам у Саборы Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне (Нью-Ёрку) за палеглых гэрояў і змагароў слуцкіх і ўсіх іншых беларускіх.

Пасьля Божае Службы, парафіяне й госьці сабраліся ў парафіяльнай залі на смачны абед прыгатаваны жанчынамі з Нью-Ёрку й Нью-Джэрзі й на афіцыйную частку сьвяткаваньня. Даклад на тэму дня чытаў Сп. Барыс Данілюк. Тэкст дакладу друкуецца ніжэй.

Таксама прысутны на сьвяце быў Сп. Я. Ясьвіловіч, сёньняшні госьць з Лёндану й былы эміґрант з Беларускай Беласточчыны. Сп. Ясьвіловіч расказаў прысутным шмат цікавага як пра Англію так і пра беларусаў у Беласточчыне, пра беларускіх студэнтаў у Польшчы, пра сёньняшнюю будову Сабору ў Беластоку й аб адносінах палякаў да беларусаў у Беласточчыне.

☆



АГУЛЬНЫ ЗДЫМАК ЧАСТКІ ПРЫСУТНЫХ НА СЬВЯЦЕ Ў БРУКЛІНЕ

СЬВЯТА ДЗЯДОЎ СЬВЯТА ГЭРОЯЎ

Вашая Міласьць Уладыка Мітрапаліт, Паважаныя Спадарыні й Спадары!

Штогод, у пачатку лістапада, тыя з нас, што ўтрывалі ў пабожнасьці, паводле звычаю пачатага яшчэ ў перадхрысьціянскую пару, успамінаем блізкіх і любых нам сваякоў уперад нас сталых перад Божым Абліччам ды ў цэрквах, ці як жыцьцёвыя ўмовы дазваляюць, упрашаем Гаспадара над усімі, каб даў ім вечны супакой у раі. Дзень гэтага ўспаміну годна й велічна называецца ў нас сьвятам *Дзядоў*.

Калісь, яшчэ на сваёй зямлі, нашыя бацькі адзначалі памяць дзядоў адумысловай, багатай ня толькі стравай, але й адвечнымі абычаямі вячэрай, на якую заклікалі прыйсьці й душы памерлых.

Мы-ж, дзе жыцьцёвыя ўмовы на гэта дазваляюць, у канцы гэтага месяца зноў зыходзімся грамадамі, каб даць чэсьць памяці тых, што аддалі жыцьцё за Бацькаўшчыну. Таму, што звычай гэты яшчэ нядаўні й пачаты дзеля адзначэньня ўгодкаў Слуцкага змаганьня, дык і стаў ён у нашай сьведамасьці сьвятам пашаны ў першую чаргу ўзрыву да бою случчакоў, а апошня ўсіх упалых у баёх за наш Край і Народ — Днём Гэрояў збройных учынаў.

Аднак месца, якое нам Бог даў за Бацькаўшчыну на зямлі ды выніклая з гэтага мінуласьць нашага народу, сталі прычынай таго, што ня толькі абарона Краю ад бясконцых варожых навалаў, але й самое пражыцьцё й захаваньне ў Ім дадзенае нам Богам апрычонасьці было заўсёды й застаецца дасюль гэраізмам.

З увагі на гэта, мне здаецца, што настала пара злучыць наш адвечны народны ўспамін памяці ўсіх памерлых зь нядаўнім звычаям адзначэньня ўгодкаў Слуцкага змаганьня ў вадно, запраўды вялікае ўсяму нашаму Народу сьвята, якое Ён сам назваў любасным словам — *Дзяды*.

Мне даводзіцца ўжо няраз казаць Вам праз ня толькі краёвага, але й сьветняга значэньня дакананьні нашых вояў на баёвых палёх, але дзейнасьць тых, што прычыніліся да гэтага ўзаплечы, што будавалі матэрыяльную базу супрацьціву ворагам ды ўрэшт тварылі правам будынь нашае магутнае й слаўнае дзяржаўнасьці й гэтымі дасягненьнямі баранілі Ейную незалежнасьць, як ад хвальшывых прыяцеляў, гэтак і ад неадчэпных ворагаў, усё гэта, плод іхняе дзейнасьці ды іхнія імёны заставаліся вонках увагі. Але, калі тое, што яны асягнулі на гэтулькі значное ў жыцьці нашага Народу, амаль, як і дар крывёю, тады ці-ж ня робім мы Ім несправядлівасьці ды не зракаемся перайма Іхняе спадчыны, а праз гэта й павагі да сябе й нашае сьціплае дзейнасьці ды сьледу па ёй?

Пара, што мы ў ёй жывём багатая тысячнымі ўгодкамі ў гісторыі славянскіх народаў. Сьвяткаваў, або будзе сьвяткаваць ці адзін зь іх тысячу год ад умоўнае даты заснаваньня дзяржаўнасьці, прыйма хрысьціянскае веры ды й іншых важных падзеяў. Мінула, бяз сумлеву, і тысяча год ад заснаваньня нашага асобнага Гаспадарства. Мы ня мелі права праз гэта прамаўчаць, наадварот, нашым абавязкам было адзначыць гэтую, праз гэтулькі пакаленьняў чаканую Дату, як мага голасна й урачыста.

І нельга сказаць, каб Яна заставалася ў няпамяці. Загадзя яшчэ, бо ў канцы 60-х і ў пачатку 70-х гадоў, у ліку прысутных у гэтай залі былі людзі, што калацілі ў дзяцкія дзьверы ды гаварылі з кожным, хто слухаць хацеў, каб устанавіць за ўмоўную, але й неапрэчную дату пачатку існаваньня нашае дзяржаўнасьці 975-ты год ды годна гэты факт адзначыць у 1975-м годзе.

Нажаль іхнія прапановы, аргумэнтаваныя нават у нашай эміграцыйнай прэсе, засталіся бяз водгуку. Затое, калі пазьней нявedама дзе зьявілася ананімная паштовачка, што абвесьціла 1980-ы год 1000-годзьдзем нашае дзяржаўнасьці, тыя-ж моўклыя раней дзеячы схамянуліся на мамэнт, напісалі крыху ўзбоч тэмы ў газэце, са звалі пару нялюдных сходзікаў, а пасьля ўраз і зьнядужалі. Засталася адно крыўда за наш слаўны Народ ды сорам да сьлёз.

Падобнае адбываецца ў нас і з успамінам найважнейшых падзеяў, што побач прыйма хрысьціянства, найбольш спрычыніліся да сфармаваньня нашае нацыянальнае псыхікі, пачуцьця справядлівасьці й усялякіх звычаяў. Падзеяў, што зьмест іхняга твору пакінуў за звыш як 300 год узьдзеяньня на жыцьцёвы лад нашых прадзедаў нясьцерты дасюль сьлед рознасьці ад суседаў ды да сяньня лучыць нас у вадну нацыю.

Маю гэтта на ўвеце ўстанаўленьне Статутаў Вялікага Княства Літоўскага 1529-га, 1566-га й 1588-га гадоў, што стварылі найбольш прагрэсыўную, як на той час, праўную падмуроўку нашае магутнае й слаўнае ў той час Дзяржавы. Кожны, малавеле знаёмы зь іхнім зьместам, ня можа не адчуць пашаны й узьдзіваваньня да тых, што гэтыя правы абдумоўвалі, укладалі ў словы й вязалі ў пасьдоўную гуманную сыстэму.

Уваход у сілу кожнага з гэтых Статутаў рабіў гэтак значныя, але паступовыя зьмены ў дзяржаўнай будове, грамадзкім ладзе й нат прыватным жыцьці грамадзян Вялікага Княства Літоўскага, што можна сказаць праз крыху больш як 50 год гэтага працэсу ў нас адбылася без праліцьця крыві ўсёахопная рэвалюцыя.

Гэтак глыбокія зьмены ў нацыянальным жыцьці іншых народаў адзначаюцца адумысловымі ўрачыстасьцямі й тое-ж неабходна зрабіць у нас, вызначаючы, на маю думку, дзень прыйма першага Статуту, 29-га верасьня, сьвятам устанаўленьня ў нас канстытуцыйнае манархіі, сьвятам нашае даўняе канстытуцыі, сьвятам Статуту Гаспадарства Літоўскага, што дачакаецца разам з нашай дзяржаўнасьцяй ягонага ўзнаўленьня ў чацьвертай рэдакцыі.

Нам пашчасьціла жыць парою, калі збываюцца 450-я, 420-я й 400-я ўгодкі прыйма гэтых векапомных правоў, але нажаль праз гэта ў нас магільная моўнасьць, бо тыя, што паставілі сябе на чале блізкога замерця вызвольнага руху, займаюцца дзейнасьцяй якраз узрушу гэтага руху. Таму я лічу сваім абавязкам і сяньняшнюю ўрачыстасьць адпаведным месцам коратка на гэтую тэму выказацца.

Летась я ўспамінаў гэтта, што ў 1410-м годзе супольна з Польшчай, Вялікае Княства Літоўскае ў біцьве пад Грунвальдам зламала моцную пагрозу нямецкіх рыцараў, што вісела над

(працяг на 3-й бачыны)

Беларусы Служаць Усім, Толькі не Сабе

Хіба што на сьвеце няма дабравольных нявольнікаў, а каб яны былі, то многіх Беларусаў трэба было-б залічыць да такіх дзівакоў. Глянем толькі што робіцца ў свабоднай Амэрыцы й на эміграцыі наагул.

З тога міліёну ці больш беларускіх эмігрантаў прыехаўшых у Амэрыку, пераважна на пачатку нашага стагодзьдзя, амаль усе належаць да расейскіх цэркваў і верна служаць Расейцам. Тыя зь іх, што лічаць сябе каталікамі, пайшлі да Палякаў і таксама прапалі.

Беларуская эміграцыя пасьля ІІ-е Сусьветнае Вайны была больш сьведамая нацыянальна, але ўсяроўна не змагла належна зразумець паняцьця свабоды. Псыхіка ніжасьці і прывучаная патрэба да чужога пана, выклікалі ў ёй, і далей выклікаюць, недавер да свайго беларускага аўтарытэту што ў галоўным прычынілася да тых трывалых падзелаў і сварак.

Адна частка „дзеячаў" пайшла пад грэцкую царкоўную юрысдыкцыю і ўладу. Сёньня Грэкі добра адносяцца да Беларусаў, але калі стане якое няшчасьце або непрадбачаная сытуацыя, тыя цэркві якія Беларусы пабудавалі ў грэцкай юрысдыкцыі перойдуць Грэкам і тым Беларусам нічога не застанецца.

Горш з беларускімі каталікамі якім пра-польскі Рым, згодна са сваімі плянамі на далёкую будучыню, дае толькі вуніяцтва. Рым падтрымоўвае беларускае вуніяцт-

(працяг на 4-й бачыны)

Сьвята Дзядоў, Сьвята Гэрояў

(працяг з 2-й бачынкі)

нашым Краям працягам пару стагодзьдзяў з паўночнага захаду. Татарская навала, дакаціўшыся мяжы нашых земляў стала і толькі неспадзеўнымі загонамі ўнутро, чыніла парой вялікія шкоды й спусташэньні.

Нажаль карысьцяў міру нават пасьля гэтых перамогаў і ўдачаў Вялікае Княства Літоўскае не дазнала. З усходу бо, пачынаючы з 1380 г. пачаў грукаць у ягоныя брамы цяжкім тараном новы вораг — маскоўскі імпэрыялізм. І гэтта выявілася, што дзеля

«...вызначаючы, на маю думку, дзень прыйма першага Статуту, 29-га верасьня, сьвятам устанаўленьня ў нас канстытуцыйнае манархіі, сьвятам даўняе канстытуцыі, сьвятам Статуту Гаспадарства Літоўскага, што дачакаецца разам з нашай дзяржаўнасьцяй ягонага ўзнаўленьня ў чацьвертай рэдакцыі.»

ўмацаваньня звонку трэба ўпарадкаваць хату ў сярэдзіне.

Першым крокам у гэтым напрастку быў Статут 1529-га году, але паколькі кадыфікаваў ён існуючыя ящчэ фэадальныя парадкі, г.зн. уладу ў краі князя зь вялікімі панамі, не здаволіў ён шырокае масы баяроў-шляхты, што несла на сабе цяжар абароны дзяржавы, а голасу ў ейным кіраваньні не атрымала. Дзеля гэтага, зараз-жа пасьля ўваходу гэтага Статуту ў сілу, 1-га студзеня 1530 г., пачаліся чалабітныя да Вялікага Князя з рознымі дамаганьнямі, што спрычыніліся ўрэшце да пакліканьня камісыі дзеля складу Статуту нанава. Пасьля розных затрымак і адкладаў камісыя гэтая закончыла сваю працу ў 1562-м годзе.

Паколькі аднак Вялікі Князь Літоўскі, на той час Жыгімонт Аўгуст, ня быў самаўладным, як усходні сусед, князь маскоўскі, дык ухвалу зьмененага Статуту папярэдзілі выдадзеныя ўперш на сойме ў Вільні ў 1563-м годзе Вялікім Князям із згоды Паноў Рады прывілей, у якім скасоўваліся асаблівыя правы магнатаў і пяршынство каталікоў, а пазьней на сойме 1564-га году ў Бельску яшчэ адзін прывілей, што падзяліў гаспадарства на 30 паветаў, з паветавымі соймікамі, складзенымі з усяго баярства, на чале кожнага зь іх, што супольнай радай выбіраў мясцовых ураднікаў і галоўным чынам судзьдзяў, перад якімі роўна адказвалі, як вялікія паны, гэтак і дробная шляхта-баяры.

Урэшце 1-га сакавіка 1566-га году й новы Статут з прывілеям Вялікага Князя становіцца аснаўным правам Вялікага Княства, ці як звалася яно яшчэ — Гаспадпрства Літоўскага.

Статут гэты падзелены на 14 разьдзелаў, а кожны разьдзел на артыкулы, што іх агульным лікам 367 (у вадрозьненьне ад першага Статуту, у якім было 13 разьдзелаў з колькасьцяй артыкулаў у залежнасьці ад заханых сьпіскаў ад 230 да 278).

Не пералічваючы й не ўваходзячы ў зьмест паасобных разьдзелаў адзначу толькі, што першыя 3 зь іх ахоплівалі дзяржаўнае права, 4-ты судовы лад і працэс, 5-ты да 10-га ўлучна — грамадзкае права, а 11-ты й наступныя разам з 14-ым — крымінальнае права.

Другі Статут Вялікага Княства Літоўскага бязумоўна, як і кожны твор людзкога розуму й рук, не ідэальны збор правоў, бо галоўным чынам дзеля вайны з Масквою прыняты без даўжэйшых разваханьняў зь недаглядам шмат якіх справаў, але ўсё-ж таксама, як і папярэдні ды й наступны — трэйці, быў адзіным сыстэмазаваным кадэксам правоў у Эўропе 15-га стагодзьдзя.

У трэйцяй ягонай рэдакцыі паратрываў ён у колькі створаных пад расейскай акупацыяй губэрніях Літвы аж да 1840-га году, гэта значыць разам звыш 300 год. Рэгулюючы працягам гэтак даўгога часу ўсе галіны жыцьця гэтулькіх пакаленьняў нашага Народу, стаўся ён у нашай сьведамасьці, не зважаюча на акупанцкія загады й канстытуцыі, той мерай, якою мы важым справядлівасьць на гэтым сьвеце.

Хоць гісторыя захавала прозьвішчы колькі „дахтароў права замежных унівэрсытэтаў", што былі сябрамі камісыі дзеля складу другога Статуту, зь ягонага зьместу відаць, што галоўную апрацоўку зрабілі няўспомненыя ведальнікі краёвага права й звычаяў ды патрыёты нашае Бацькаўшчыны, бо йнакш у ім ня было-б засьцярогі, каб пісар „...рускімі літары й словы" мусеў пісаць.

Ці-ж у дзень Гэрояў, Сьвята нашых слаўных Дзядоў, мы можам забыцца на гэтых няведамых імёнамі стваральнікаў нашае даўняе велічы, што ня толькі ў сіле, але й у справядлівасьці выяўлялася?!

Не, мы ніколі не забудзем, мы й увесь наш Народ, як доўга будзем заставацца на сьвеце, памятаймем тых, што аддалі жыцьцё Бацькаўшчыне ня толькі на баёвых палёх, але й тых, што пакінулі па сабе сьлед у кожнай дзялянцы нацыянальнага жыцьця і памяць гэтая будзе ў роўнай славе!

— *Барыс Данілюк*

ПЕРАВЫДАДЗЕНЫ НОВЫ ЗАПАВЕТ

Новы Запавет і Псалмы ў перакладзе Антона Луцкевіча й Лукаша Дзекуць-Малея (Лёндан, 1948) перавыдадзеныя Глабальным Місіянерскім Радыёслужэньнем на чале якога стаіць Беларус — прап. Іван Гук. Прыгожа выданая кніжка друкавалася ў Карэі з апрабатай Сусьветнага Біблійнага Таварыства. Зварачацца на адрас:

Global Missionary Radio Ministries,
Box 303, Station D, Toronto, Ontario M6P 3J9, Canada.

Byelorussian Language is in Trouble

(continued from page 1)

schools" — as the "main reason for the poor quality of many works of literature published in the republic.

Also worth noting in this connection is the book-lenght Byelorussian samizdat document titled *The Native Word and Moral-Esthetic Progress* that has recently been published in the West. One of the contributors to this work suggests, among other things, that Byelorussian be declared the state language of the republic along with Russian, and that the system of higher education in the republic be Byelorussianized.

The latest contribution to this discussion is the article by Mr. Tarasau who, it should be noted, is the author of a collection of essays on Byelorussian history from the earliest times to the mid 19-th century that was published in Minsk in 1984, and that was so severely taken to task for a variety of "ideological sins" on the pages of *Kommunist Belorussii* earlier this year. It would appear that this criticism, which came close to accusing the author of the cardinal sin of nationalism, has left Mr. Tarasau unfazed.

His article in *Litaratura i Mastatstva* left only one thing unsaid, who is responsible for creating the kind of climate in Byelorussia (and in other non-Russian republics) whereby parents come to the conclusion that the native language is, in effect, irrelevant.

Калядны Зварот

Хрыстос Нарадзіўся — Яго Слаўце!

Дарагія Браты і Сёстры Беларусы!

Кансысторыя Сьвятой Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы шчыра вітае ўсіх Вас з вялікім і радасным сьвятам Нараджэньня Хрыстовага, ды выказвае найлепшыя пажаданьні ўсялякага дабра і шчасьця ў Вашым жыцьці.

На прыкладзе праваслаўных эмігрантаў іншых народаў мы бачым, якое вялікае значэньне мае свая родная Царква ў грамадзка-нацыянальным і культурным жыцьці згуртаваных пры парафіях вернікаў. Такой нашай роднай Царквою ёсьць толькі Б.А.П.Ц., роўна тут на чужыне і на Бацькаўшчыне. Нажаль, двухвяковая страта свабоды нашае Бацькаўшчыны і ліквідацыя Масквою нашае старое Царквы спрычынілася да таго, што каля двух мільёнаў Беларусаў на чужыне па нясьведамасьці сваей астаюцца ў бальшыні пры Расейскай Царкве, а блудная жменька апынулася навет у юрысдыкцыі Грэцкае Царквы.

Дарагія! Пара ўжо нам належна асьвядоміцца ў гэтых фактах і пачаць вызваляцца з „няволі вавілонскай", асабліва тут на вольнай зямлі Вашынгтона. Таму мы яшчэ раз зьвяртаемся з гарачым заклікам да ўсіх раскіданых па Божым сьвеце праваслаўных Беларусаў гуртавацца вакол свае роднае Царквы і ў гэты сьветлы калядны сэзон, калі кажны з нас стараецца абдарыць-пацешыць сваіх бліжэйшых нейкім падарункам, падтрымаць, успамагчы Яе сваімі шчодрымі ахвярамі. Усім ахвярадаўцам сардэчнае дзякуй у Імя Хрыста, Збаўцы нашага.

Ласкавыя ахвяры просім высылаць на адрас:

BAOC Consistory
401 Atlantic Avenue
Brooklyn, N.Y. 11217, U.S.A.

ORTHODOXY IS EXPANDING IN THE U.S.

Evangelical Orthodox Church enters Antiochian Othodox Archdiocese of North America

There are a number of Christian churches in the U.S. which, over the years have so changed or reformed that they bear little resemblance to the original Christian church. The largest among these is the Roman Catholic Church which for centuries was more interested in power and politics than in religion.

On the other hand, there are sincere members of these churches who energetically seek out the mainstream of historic Christian faith and in doing so are forced to resign their church membership and to form new groups.

One such group is the *Evangelical Orthodox Church* (EOC) founded in 1979 in California. Its 2500 members and 19 bishops came from various Christian backgrounds, including Roman Catholic, to form a new church which "holds to the biblical faith believed, taught and confessed by the Orthodox church" as the only major church today which adheres to the mainstream of the Christian faith.

On September 8, 1986, the EOC reached an agreement with the Antiochian Orthodox Church which is one of five ancient canonical patriarchates located in Damascus, Syria. Its head in North America is Metropolitan Philip Salbia.

According to the agreement, the former bishops of the EOC will be demoted to the rank of priests or archpriests, but will retain their congregations. The EOC congregations will become parishes of the Antiochian Orthodox Archdiocese of North America following chrismation and the EOC clergy will become orthodox clergy after ordination. The liturgical practice of the EOC will be orthodox.

AMNESTY INTERNATIONAL IN SUPPORT OF KUKABAKA

On October 30, 1986, *Amnesty International* organized a demonstration in front of the Soviet Mission in London in support of Byelorussian dissident Michael Kukabaka. This annual demonstration has been held in London on this date since 1982 when it was first learned that every year on October 30, Kukabaka goes on a hunger strike to protest his long imprisonment in Soviet prisons, labor camps and psychiatric hospitals. Kukabaka's sole "crime" against Moscow was to protest Soviet invasion of Czechoslovakia in 1968 and to practice his religion.

News of the demonstration in London was sent by *Amnesty International* to official Soviet newspap-ers, "Pravda", "Izvestia" and the "Literary Gazette". In addition, *Amnesty International* sent a birthday greeting to Kukabaka, who is now 50 years old and in poor health, at his prison address.

The **Byelorussian Times**

USPS 345—170

9—06 Parsons Blvd.
Flushing, N.Y. 11357, U.S.A.

A Byelorussian newspaper published bimonthly in January, March, May, July, September and November.

Dr. Roger Horoshko, Publisher
Annual subscription $8.00
U.S. currency only

From outside of the U.S.A. payment must be made by an international money order drawn on a U.S. bank *or* by a postal money order payable by the U.S. Post Office. For air mail to Europe add $4.00 or $6.00 to Australia.

POSTMASTER:
Send address changes to the
BYELORUSSIAN TIMES
Post Office Box 141
Whitestone, N.Y. 11357

SECOND CLASS POSTAGE PAID AT FLUSHING, N.Y. 11355

ЧАС

Двумоўная Беларуская Газэта

Др. Р. Гарошка, выдавец

Выходзіць 6 разоў на год у студзені, сакавіку, травені, ліпені, верасьні й лістападзе.

Падпіска за 6 нумароў газэты (гадавая) каштуе $8 даляраў у Амэрыцы. З іншых краінаў грошы павінны быць перасланыя ў *амэрыканскіх далярах* банкавым або паштовым грашовым пераказам.

Лётніская перасылка каштуе дадаткова: $6 да Аўстраліі й $4 да краінаў Эўропы.

Згодна з паштовымі законамі, ніжэй друкуецца асьведчаньне якое паказвае нашае частковае выкарыстоўваньне ў рассылцы газэты т.зв. другое або газэтняе паштовае клясы.

STATEMENT OF OWNERSHIP
MANAGEMENT AND CIRCULATION

1A) Title of publication: The Byelorussian Times. 1B) Publication No. 345170. 2) date of filing: November 12, 1986. 3) Frequency of issue: Bi-monthly. 4) Location of known office of publication: 9-06 Parsons Blvd., Malba, N.Y. 11357. 5) Location of the headquarters or general business offices of the publishers: 9-06 Parsons Blvd., Malba, N.Y. 11357. 6) Names and addresses of publisher, editor, and managing editor: Publisher: Dr. Roger N. Horoshko, 9-06 Parsons Blvd., Malba, N.Y. 11357; Editor: Valentine Horoshko, 9-06 Parsons Blvd, Malba, N.Y. 11357. 7) Owner (If owned by a corporation, its name and address must be stated and also immediately thereunder the names and addresses of stockholders owning or holding 1 percent or more of total amount of stock. If not owned by corporation, the names and addresses of individual owners must be given. If owned by a partmership or other unincorporated firm, its name and address, as well as that of each individual must be given. If the publication is piblished by a nonprofit organization, its name and address must be stated.) (Item must be completed.): Dr. Roger N. Horoshko, 9-06 Parsons Blvd., Malba, N.Y. 11357. 8) Known bondholders, mortgagees, and other security holders owning or holding 1 percent or more of total amount of bonds, mortgages or other securities: None. 10) Extent and nature of circulation. Average No. copies each issue during the preceeding 12 months. A. Total no. copies printed: 450. B. Paid circulation. Sales through dealers and carriers, street vendors and counter sales: 0. Mail subscriptins: 175. C. Total paid circulation: 175. D. Free distribution (including samples): 58. E. Total distribution: 233. F. Copies not distributed above. 1. Office use, left over, unaccounted, spoiled after printing: 217. 2. Return from news agents: 0. G. Total: 450. Single issue nearest to filing date: A: 450. B-1: 0. B-2: 162. C: 162. D: 69. E: 231. F-1: 219. F-2: 0. G: 450. 11. I certify that the statements made by me above are correct and complete. Dr. Roger N. Horoshko, publisher.



ВЫПІСВАЙЦЕ Й ПАШЫРАЙЦЕ АНГЕЛЬСКА—БЕЛАРУСКУЮ ГАЗЭТУ «БЕЛАРУСКІ ЧАС»

НОВЫЯ ВЫДАНЬНІ

• **ГОЛАС ЦАРКВЫ**, Нр.59, Каляды 1986/87. Выданьне *Рады БАПЦ*. 28 бачынак. Зьмешчаныя: Калядные Архіпастырскае Пасланьне Мітрапаліта Ізяслава, Першагерарха БАПЦ; Калядныя вітаньні; „Выясьненьне" аб тым, што „ўва ўсім сьвеце існуе толькі адна Беларуская Царква і Ёю ёсьць Сьв. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква з Яго Высока-Прэасьвяшчэнствам Мітрапалітам Ізяславам на чале."; Калядны зварот Каныстоі; Крытычны агляд Праваслаўя й Рымскага Каталіцызму Арх. Мэтодіосам, Экзархам Экумэнічнай Патрыярхіі на Вяліка-Брытаніі; „Да ідэі тысячагодняга юбілею" — як і ці трэба нам беларусам сьвяткаваць тысячагодзьдзе хрышчэньня *Русі* і якое значэньне яно мае да хрышчэньня Беларусаў; Парахвіяльная хроніка; Сумная хроніка; і інш. Цана 3 даляры. Зварачацца на адрас:
BAOC Consistory
401 Atlantic Avenue
Brooklyn, N.Y. 11217, U.S.A.

• **АБ БАГОХ КРЫВІЦКІХ СКАЗЫ**, *Сяргей Хмара*, Выданьне другое, Таронта, Канада. Выдавецтва *Баявая Ўскалось*. "Legends of Kryvichian Gods" (Byelorussian mythology), *Bayavaya Uskalos*, Toronto, $5.00.

• **РУСЫФІКАЦЫЯ ПА БССР-АЎСКУ.** *Голас Радзімы* ў сваім выданьні „На Зямлі Бацькоў", 1983, бязсорамна піша: „У Савецкім Саюзе, многанацыянальнай краіне, няма адзінай дзяржаўнай мовы. Кожная Рэспубліка карыстаецца сваёй роднай. Але *Руская*, блізкая і зразумелая многім, стала мовай *міжнацыянальных зносін*.

Вясёлых Калядаў
і Шчасьлівага Новага Году

ўсяму духавенству Б.А.П.Ц., усім падпішчыкам, журналістам, выдаўцом беларускае прэсы, знаёмым і ўсім Беларусам
шчыра жадаюць
Валентын і Расьціслаў Гарошка



НА ПАХОВІНАХ МАТУШКІ КАЦЯРЫНЫ АБАБУРКО Ў АНГЛІІ 5-га ВЕРАСЬНЯ 1986 г.. НА ЗДЫМЦЫ: Прат. а. ЯН ПЯКАРСКІ ЗЬЛЕВА З КНІЖКАЙ, Мітр. Прат. а. ЯН АБАБУРКО ЗПРАВА Й ПАМІЖ ІМІ ДВА ЎКРАІНСКІЯ СЬВЯТАРЫ.

*Парахвіяльная Рада Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне,
Беларуска-Амэрыканскі Рэспубліканскі Клюб у Нью Ёрку,
Місійнае Таварыства Б.А.П.Ц.,
і
Згуртаваньне Беларусаў Амэрыкі,
шчыра жадаюць,
усім Беларусам на эміграцыі й на Бацькаўшчыне,
Вясёлых Калядаў
і
Шчасьлівага Новага Году*

Беларусы Служаць Усім, Толькі не Сабе

(працяг з 2-й бачынкі)

ва й нават фінансуе беларускую бібліятэку імя Фр. Скарыны ў Лёндане з мэтаю, ясна, перахрысьціць праваслаўных на вуніятаў. Праўдаж, за мінулых 30 ці 40 гадоў перахрыстамі былі толькі адзінкі й галоўны з іх, гэта сёньняшні лідар беларускіх вуніятаў, а. Надсан.

Але прадбачваецца трагэдыя з той беларускай бібліятэкай у Лёндане. Належачы да каталіцкае царквы, Рым, і праз Рым Палякі, могуць рабіць зь ёю што хочуць і калі хочуць. Будзем бачыць, што прыйдзе час калі бібліятэку імя Фр. Скарыны забяруць ворагі Беларусі. Ня гледзячы на гэта, некаторыя праваслаўныя, як, напрыклад, сябры ўраду БНР, пры кожнай нагодзе нізка кланяюцца лідару беларускага вуніяцтва й выхваляюць яго за дзейнасьць у той бібліятэцы ды таксама, пры кожнай нагодзе, зьневажаюць сваю родную БАПЦ. Такім чынам, тыя псэўда-патрыёты б'юць паклоны не свайму, а Рыма-Польскаму аўтарытэту.

Тыя, каго ані Расейцы, ані Палякі, ані Грэкі ані вуніяты не прыманілі, здаваліся-б, былі-б стойкімі Беларусамі, але-ж гэта не зусім праўдлова. Частка з гэтае групы замяніла паклон чужому аўтарытэту пакланам анархіі. Яны ня могуць зразумець, што анархія гэта не дэмакрацыя й не свабода, а наадварот, гэта праява недаверу да свайго беларускага аўтарытэту й недаверу да самога сябе.

Як прыклад анархістаў, возьмем нашых сёньняшніх адшчэпнікаў. Яны завуцца адшчэпнікамі таму, што яны паламалі самыя аснаўныя царкоўныя законы й фармальна адшчапіліся ня толькі ад БАПЦ, але таксама ад самога праваслаў'я, бо праваслаўная вера абаснаваная на законе, не на анархіі пры ягой кожны мужычышча можа даваць Мітрапаліту загады, як гэта практыкавалася ў адшчэпнікаў.

З тога міліёну эмігрантаў, застаецца яшчэ меньшая група якую ўжо можна назваць стойкай беларускай. Гэта ў бальшыні сябры праўдзівай беларускай незалежнай Царквы, БАПЦ, ачоленай Мітрапалітам Ізяславам, з парафіямі ў заходнім Вольным Сьвеце ад Англіі да Аўстраліі, ды й таксама некаторыя каталікі й іньшыя. Яны разумеюць, што Беларусь можа быць вольнай толькі тады, калі беларускі народ адкіне анархію з аднаго боку, а з другога ўсялякія паклоны чужынцам ды таксама знойдзе ў сваім сэрцы пашану да самога сябе. ☆

JEWS SEEK ALLIES AMONG UKRAINIANS

(continued from page 1)

tion of Ukrainian-Jewish reconciliaton. The key question is justice. A scrupulously fair trial and establishing Demjanjuk's identity beyond shadow of doubt are more important than finding the accused guilty. If it turns out that there is doubt about his identity, he shouls be released. The good it will do Isarael is greater than the harm."

• Украінская **НАЦІОНАЛЬНА ТРИБУНА** за 21-га верасьня, 1986 г., у артыкуле пад загалоўкам „Пра парушэньне ўкраінскага дзяржаўнага разьмежаваньня з Беларусяй" піша, што вялікая частка Палесься, затручаная Чарнабыльскай радыяцыяй, можа стаць „нейтральнаю" або нічыёю зонаю, калі там запраўды ўсё нармальнае жыцьцё будзе немагчымае або небясьпечнае.

На няшчасьце, гэты й яму падобныя іншыя артыкулы, што спатыкаюцца ў прэсе, пішуцца людзьмі якія ніякага паняцьця ня маюць аб радыяцыі і, натуральна, як усе, баяцца таго чаго не разумеюць. Пэўне-ж, блізка пашкоджанага рэактара радыяцыя моцная, але ўжо ў адлегласці за некалькі дзясяткаў кілямэтраў можна прыняць ведамыя меры якія забясьпечаць людзей, ачысьцяць зямлю й нават ваду. Патрэбныя толькі грошы або нявольнікі якіх хапае ў Савецкім Саюзе.

• 15-га сьнежаня, 1986 году, Высокапэасьвяшчэнны Ўладыка **МІТРАПАЛІТ ІЗЯСЛАЎ** выяхаў да Аўстраліі па Царкоўных справах. У Парафіі Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне Ўладыку часова заступае айцец Максім Таўпека з Канады.



ІКОНАСТАС У ПАРАФІІ СЬВЯТЫХ ВІЛЕНСКІХ МУЧАНІКАЎ СЬВ. Б.А.П.ЦАРКВЫ Ў МЭЛЬБУРНЕ, АЎСТРАЛІЯ. 1986 ГОД.

Сёмы Зьезд Беларусаў Аўстраліі Адбудзецца ў Мэльбурне 6-10 Студзеня 1987 Году